ласьць, і шчасьце ўнас саміх. Абы–б здаровымі быць, ды разам жыць, а пражывём гэты ўрывак нашага жыцьця на славу і сабе, і людзям. Любая, чакай ліста яшчэ. Будзь здарова. Моцна–моцна цалую Цябе.

Твой *Адзік*.

Забяры пай з ЖАКТу „Камунар–асьветнік“. Наогул паі прыдзецца ці перавесьці сюды, ці ліквідаваць зусім.

Калі дзеці ўжо прыехалі, дык хай памогуць і яны табе разьвязаць пытаньне пераезду. Ты ім усё раскажы і моцненька пацалуй іх за мяне.

Даведайся пра беларускі слоўнік, што Язэп браў, ці дома ён і ці льга яго цяпер забраць, калі няма дома.

## № 57. Ганьне Бабарэцы

*24/IX–1931 г.*

Любая Анечка!

Быў я ў шэфа. Выезду ў Вятку не дазваляе. Так што, любая, на спатканьне ў Вятцы не разьлічвай. Буду чакаць тут, у Слабадзкім. Чакаць табе ў Вятцы цягніка доўга не давядзецца. З Масквы прыходзіць так прыблізна каля 11 ці 12, а з Вяткі на Слабадзкі адыходзіць у 2 ці прыблізна каля гэтае гадзіны ўночы. Давядзецца табе там пабыць усяго якіх часін са тры. Лепей будзе, калі ты абыдзешся сама сабою. Лістоўку да М[аксіма] Г[арэцкага] я напішу, а ты, калі хочаш, каб цябе ён спаткаў, дасі яму тады тэлеграму або напішаш лістоўку, але з такім рахункам, каб яна дашла да яго к таму часу, як будзеш ты ехаць. Ніч[ыпара] адраса ня ведаю. Так што яму пісаць ня буду. А мо' Макс[іма]ва будзе ехаць разам з табою. От–бы добра было. Зрэшты, лепей за ўсё разьлічваць на самую сябе. Тут я спаткаю з хурманкаю. Ах, як хочацца Вас хараша спаткаць! Нядаўна тут адчыніўся новы магазын і ёсьць дзіцячыя цацкі. Заўтра ў мяне выхадны дзень, пайду і выбяру для сваіх любенятак слаўных. Глядзі толькі, любая, не нагружайся ў вагон, бо трудна табе будзе з рэчмі і дзецьмі ехаць. Вазьмі толькі што есьці да падушку з коўдраю, каб было на чым прысланіцца і дзецям, і самой, а рэшту ўсё здавай у багаж і на малую скорасьць. Моцна–моцна цалую Вас, мае любыя.

Ваш *Адам*.

## № 58. [Антону Адамовічу]

*[Кастрычнік 1931]*

1) Знач[эньне] маіх ліст[оў] — бліск[уча], зачын.

2) Нашто рэцэпт для перах[оду] Л[ужаніна] ад ст[арога] да н[овага] — усьведамл[еньне] патрэбнасьцяй і інтарэсаў Л[ужаніна] — думаю, ня наша задача. Мы пав[інны] усьведам[ляць] патрэбы бел[арускай] поэзіі.

3) Прыраўноўваньне свайго перах[оду] да новага з Луж[аніным] няправільнае. Ці заўв[ажыў] ты, як ён зьнік у тваім лісьце і як на сцэн[у] выйшла „Дзяўчына“? Гэта паказв[ае], што ён і трапіў туды выпадкова.

4) Адказу на пытаньне „Як перайсьці ад ст[арога] да н[овага?“] так і няма ўсё–ж. (Прадмет перажыв[аньня] зрабіць прадм[етам] мысьлі, з адчув[аньнем]